Цана асобнага нумару 20 гр.

Opłatę pocztową uiszczono ryczałtem.

ГОЛАС ПРАЦЫ

Выходзіць два разы у тыдзень.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12—6 (Wileńska 12. m. 6) Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзён. Адміністр. ад 9 да 3.

Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 1 зл. 50 гр. Для заграніцы ўдвая даражэй. Перамена адрасу 30 гр.

Нявырынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукаван. залежыць ад Рэдакцыі.

Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 грош за радок петыту ў 1 шпальту.

№ 4 — Вільня, Серада 25-га красавіка 1928 г. — Год 1

Словы на вецер.

Працэс Беларускай Сялянска-Работніцкай Грамады выявіў не адну цікавую старонку ў адношаньнях польскае ўлады да беларускага руху наагул і асабліва ў адношаньнях да руху беларускіх сялян і работнікаў.

У зьвязку з гэтым працэсам, супакоеная, здавалася, ужо думка польскага буржуазнага грамадзянства пачынае зноў, як у пэрыяд расцьвету дзейнасьці Грамады, набіраць характару нэрвознасьці і непакою. На шпальтах польскай прэсы, самага рознага кірунку, асабліва віленскай, пачынаюць усьцяж зьяўляцца стацьці, якія заклікаюць да перагляду „опініі“ (зразумела, польскай буржуазіі) ў адношаньні да беларускага, так „загадковага“ да яе, пытаньня. Калі манархічнае „Słowo“ ды эндэцкі „Dzeńnik“, у якіх гэта пытаньне і цяпер усё вырашаецца даволі проста, а іменна, што яно патрабуе, як і заўсёды, „цяжкай рукі“, ці ўзброенага кулака — трошку нібы іншыя думкі ўносяць слабенькія віленскія „санатчыкі“, якія групуюцца каля „дэмакратычнага“ Kurjer'a Wilensk'ага. Курвіленцы, інтарэсы якіх больш зьвязаны з Зах. Беларусьсю, непакояцца, трэба сказаць, больш за сваіх саюзьнікаў. А цяпер яны прыходзяць раптам да перакананьня, што трэба нешта зьмяніць у адношаньні да беларусаў, што трэба правясьці далей „санацыю“. Яны констатуюць, што ў беларускім пытаньні ўрадовая палітыка папала ў тупік, і што працэс Грамады ёсьць навет абмылкай, якая пойдзе на карысьць „суседняга гаспадарства“. Розуму ў „санатчыкаў“ не хапае, каб паказаць выхад, але яны толькі канстатуюць, што польская палітыка была „bezwzględna“ ў адносінах да беларусаў, што суд над Грамадой ёсьць суд над беларускім народам, што „Грамада і цяпер магутна“ „K. W.“ № 90 (1137) і што трэба направіць неяк справу, каб не апынуцца перад катастрофай.

Словы гэтыя нібы ўносяць разнабой у аднадушную дасюль думку ўсяе польскае буржуазіі, робячы з курвіленцаў свайго рода рыцараў, нейкіх адвакатаў, ды могуць урэшце выклікаць ілюзіі ў беларускім грамадзянстве, якое дасюль чула і бачыла толькі самае горшае.

Трэба было-б сказаць шмат горкай праўды няпрошаным заступнікам, якія ўвесь час дасюль памагалі абшарнікам і капіталістым граміць беларускі сялянска-работніцкі рух, а цяпер праліваюць кракадылевыя сьлёзы над направай адносінаў, але тут маленькае „але“. Калі гаварыць рэчова ці прынцыпова з пункту гледжаньня беларускіх сялян і работнікаў—няма ніякае пэўнасьці, што гэтае „але“ дойдзе да чытачоў, а не абмежыцца столікам цэнзара ды аграмадным пакоем, які трэба даўно ўжо ахрысьціць Вялікім Архівам беларускай сялянска-работніцкай прэсы. Урэшце шкада раскідаць словы перад гэтымі унтэр-афіцэрскімі жонкамі, якія цяпер самі сябе лупцуюць. Мы хацелі-б толькі зьвярнуць увагу беларускага грамадзянства на тыя ілюзіі, аб якіх сказана вышэй, што да шчырасьці гэтых слоў.

Што канкрэтнага дае гэты плач курвіленцаў? Нічога, літэральна нічога. Гэта толькі канстатаваньне правалу сваей уласнай палітыкі ў адносінах да беларусаў, гэта толькі „кусаньне сябе за хвост“ ды ўрэшце „цацанкі-абяцанкі“, якія хіба толькі розным Янкам Станкевічам ды некаторым „ня унтэр-афіцэрскім“ жонкам могуць прыносіць радасьць. Заправуды вельмі характэрна, што, прыкідваючыся донкіхотамі, курвіленцы не падаюць навет свайго спосабу направы адносінаў. І гэта зусім ня дзіва. Яны больш нічога і ня могуць сказаць, бо з імі ніхто паважна й ня лічыцца, ані з беларусаў, ані з іх цікавых саюзьнікаў, з Мэйштовічам на чале. Мы гатовы бачыць навет у самым выступе курвіленцаў не самастойны шаг, а пэўную гульню артыстаў, якім заказана „згуляць штуку“. А тады гэты плач артыстаў-курвіленцаў ёсьць нішто іншае, як жаданьне якраз выклікаць сярод беларускай інтэлігенцыі зноў пустыя надзеі ды пацешыць „наўчонага спадара“, з якім яшчэ ўсё гуляюць у хаванкі. Другога нічога ў ім ня можна знайсьці навет „пад мікраскопам“. Гэтыя „песьні страстныя“ зьвернены якраз ня ў бок „польскага грамадзянства“, а ў бок лёгкавернай часткі беларускай інтэлігенцыі. Бо-ж вядома, што сярод польскай буржуазіі курвіленцы нічога ня значаць.

Беларускія сяляне і работнікі ня робяць сябе ніякіх ілюзіяў з гэтых цацанак. Яны знаюць, што гэта—словы на вецер, якіх ніхто ня слухае, ані „ўладу маючыя“, ані ўлады ня маючыя. Цацанкаў гэтых даволі наслухаліся, калі хто ім верыў, той пасьля горка плакаў.

Беларускія сяляне і работнікі вераць толькі ў свае ўласныя сілы.

Працэс Белар. Сялян.-Работн. Грамады.

З прычыны таго, што нашаму карэспандэнту ня далі пропуску на 24 і 25 дзень працэсу, падаем далейшы працяг працэсу бяз гэтых дзён. Гэтыя дні пастараемся падаць у наступных нумарох, узяўшы іх з польскіх газэтаў.

26-ты дзень працэсу Грамады.

Суд пастанавіў дапрасіць найважнейшага з боку пракуратуры сьведку Бабіча пры зачыненых дзьвярох. Навет найбліжэйшыя прадстаўнікі сем'яў абвінавачаных ня былі дапушчаны.

Сьв. Масьлянка, пал. з Глыбокага, кажа аб Антону Сакалоўскім, Стоціку і Нікіфароўскім. Сакалоўскі быў кіраўніком філіі Белар. Банку ў Глыбокім. У дню, у якім быў адчынены гэты аддзел, Сакалоўскі атрымаў 300 даляраў і тысячу польскіх злотых, з якімі і распачаў дзейнасьць філіі.

Прак. Калапскі—хто прыяжджаў на адчыненьне філіі?

Сьв.—пасол Мятла і дырэктар цэнтралі Астроўскі.

Стоцік, старшыня павятовага камітэту, уступіў да Грамады быццам з намовы Мятлы. Нікіфароўскі прадаваў газэты „Наша Праўда“ і „Наша Справа“ і падчас сваей прамовы зазначыў, што хутка ўжо выганяць абшарнікаў.

Па ліквідацыі Грамады прыехаў ў Глыбокае інструктар Кіган і склікаў нейкую канфэрэнцыю, якая-б арганізавала пратэст з прычыны арыштаваньня паслоў. Удзельнікамі яе былі Скурка і Жукоўскі, скарбнік павятовага камітэту. Першы арыштаваны.

Сьв. Рачкоўскі быў сэкрэтаром гуртка. Уцягнуў яго ў Грамаду быццам абвінавачаны Лабунька.

Сьв. Фэдаровіч, асаднік, сцьвярджае, што абв. Нікіфароўскі, які да часу ўступленьня ў Грамаду жыў небагата, пасьля вёў жыцьцё заможнага селяніна. На рынку меўся асьцерагаць сялян, каб ня куплялі зямлі, бо мала — і беззямельныя хутка яе атрымаюць.

Сьв. Філютоўскі, пал., кажа, што сябры КПЗБ уступалі ў Грамаду. Нікіфароўскі, прамаўляючы на сабраньні, рэкамэндаваў асьцярожнасьць у дзейнасьці гурткоў.

Адв. Сьмяроўскі: Нікіфароўскі пры пану рэкамэндаваў асьцярожнасьць?

Сьв.—Так. Адв. Сьмяроўскі: не баяліся ж пана?.. Сьв.—Не! Іх было 258 чалавек, а я адзін. Ды й мне сказалі, каб я наагул на сабраньні не паказываўся.

Сьв. Войтаў кажа, што Нікіфароўскі падкрэсьліваў, што трэба заўсёды паказываць на карысьць сваіх, навет пад прысягай.

Сьв. Ігнацёнак—Каз. Шульга быў савецкім агентам, насіў заграніцу матэрыялы, сабраныя праз жабрака Грыневіча. У апошнія часы перад ліквідацыяй Грамады паразумяваўся з Нікіфароўскім і вербаваў сяброў да Грамады.

Сьв. Заврэўскі—экспэдытар газэт, выходзіўшых на Віленскай вул. 12, ведае, што нейкі час Мятла быў выдаўцом і што Рак-Міхайлоўскі прыходзіў у рэдакцыю і ад часу да часу зьмяшчаў свае артыкулы.

Прак. Калапскі: хто кіраваў рэдакцыяй? Сьв.—Луцкевіч, я насіў да яго карэспандэнцыю, якую перад гэтым чытаў сэкрэтар.

Адв. Петрусэвіч — ці чуў пан аб тым, што Луцкевіч бараніўся ад закідаў, быццам ён належыць да Грамады? Сьв. Гэтага ня ведаю, ня ведаю, навет, ці ён быў у Грамадзе, бо на сабраньнях ў Цэнтральным Сэкр. ніколі яго ня бачыў.

Адв Петрусэвіч: ці на газэтах было зазначана, што яны зьяўляюцца органам Грамады? Сьв. Не. Адв. Петрусэвіч: ці гэта праўда, што ў пана ў Глыбокім было сабраньне, на якім былі прысутнымі Нікіфароўскі, Сакалоўскі і іншыя і дзе абгаварваўся пляц камуністычнае працы? Сьв. Не, не, першы раз аб гэтым чую. Сакалоўскі, якога я добра ведаю, ня быў камуністым. Браў ён часта ўдзел ў аматарскіх спэктаклях і з гэтага поваду быў часта на рэпэтыцыях.

Адв. Петрусэвіч: што пан можа сказаць Суду аб абв. Стоціку. Сьв. Стоцік вучыўся ў дух. сэмінарыі, а пасьля памагаў бацьку ў гандлю.

На пытаньне абв. Рак-Міхайлоўскага сьведка выясьняе, што Р.-Міх. ніколі ня браў ніякага ўдзелу ў сабраньнях, якія адбываліся ў памешканьні сьведкі, бо ніколі ніякіх сабраньняў ня было. Па гэтым выясьняе, што некалькі асоб з рэдакцыйнага пэрсаналу газэтаў, лічаных за грамадаўскія, не належала да Грамады.

27 дзень працэсу Грамады 10/IV 1928 г.

У гэтым дню „высьвятлілася“ дзейнасьць Грамады на тэрыторыі Дзісенскага павету. Паказаньні сьведкаў датычуцца абв. Шмарылы, Шэвеля, Варанковічаў Янкі і Тодара, Лабунькі Кастуся і Ант. Даніловічанкі. Дзейнасьць іх лучыцца з дзейнасьцю Нікіфароўскага і б. паслы Мятлы.

Сьв. Аверыянаў не зьявіўся ў Суд, дзеля чаго адчытваюцца яго паказаньні, дадзеныя сьледчаму судзьдзі. З іх відаць, што абв. Лабунька вербаваў людзей да перапраўляньня карэспандэнцыі заграніцу. Насіў яе напр. нейкі Геранік Васіль. Пацьвярджае гэта і сьв. Геранік Янка, родны брат яго.

Сьв. Андзэлеўка — арганізаваў некалькі гурткоў, на запытаньне пракурора Калапскага—ці вядома яму, што Грамада імкнулася да адарваньня Заходняе Беларусі ад Польшчы, адказывае—чытаў аб гэтым у польскай прэсе.

Сьв. Буш, войт Парафіянаўскае гм., кажа аб дрэнных рэзультатах антыпадаткавае агітацыі Грамады, і аб масавым надсыланьні літэратуры.

Сьв. Белінскі—канфідэнт пав. дзісенскага, кажа аб сабраньнях канспірацыйных, арганізаваных праз абв. Даніловічанку, на якіх абгаварывана справу арганізацыі тэрорыстычных баёвак. На гэтых сабраньнях былі прысутнымі і абв. Шэвель, Смакіла, Варанковіч. Сьведка сцьвярджае, што забойства канф. Івашкевіча было вынікам партыйнага Суду.

Адв. Сенкевічанка — ці пану не вядома, што Івашкевіча падазравалі ў працы на дзьве стараны? Сьв. — не. Калі яго забілі, дык ня мог працаваць на дзьве стараны. Апрача гэтага, Саветы вызначылі нагароду за яго галаву.

Адв. Сенкевічанка—а дзеля гэтага можа забойцы хацелі толькі здабыць нагароду? Сьв.—ня ведаю.

Адв. Гонігсвіль—скуль пан мае пэўнасьць, што Івашкевіч быў забіты за адкрыцьцё шпіёнскае шайкі?

Сьв.—меў аб гэтым ведамасьці ад канфідэнтаў ды і кам. пал. можа аб гэтым пасьведчыць. **Адв. Раманкевіч** — ці баёўкі, аб якіх пан успамінаў, былі ўведены ў жыцьцё?

Сьв.—гэтага я ня сьцьвердзіў.

Сьведкі Бэеровіч, Кучэўскі, Весялоў, войты гмінаў, кажуць аб выніках антыпадатковай акцыі Грамады.

Сьв. Саўка і Дземянчонак пацьвярджаюць, што ўлады бальшавіцкія ня прымалі тых, якія не мелі грамадаўскае легітымацыі.

Сьв. Крукоўскі—кажа аб антыдзяржаўных выступленьнях абв. Козіча, які заклікаў да нелегальных сабраньняў, на якіх абгаварываўся плян паўстаньня.

Сьв. П. Даніловіч і Кішэня былі на сабраньні ў в. Тарчунах, на якім была абгаварывана справа „bojówek“. Абв. Шэвэль, Варанковічы і Даніловіч-Куляга былі на ім прысутнымі. Сьв. Кішэня паведаміў аб гэтым сабраньні паліцыю. Даніловіч, па яго славах, казаў, што з усімі канфідэнтамі трэба паступаць так, як з Івашкевічам (забіваць).

28 дзень працэсу Грамады 11./IV. 1928 г.

Першага ў гэтым дню дапытваюцца сьв. **Скальскага**, нштод. пал. Дзісьненскага павету. Кажа тое самае, што ўжо казалі папярэднія сьведкі аб забойстве канфідэнта пал. Івашкевіча. На ўсходніх землях у 1926 — 1927 г. распачалі сваю дзейнасьць тры штабы, кіруючыя антыдзяржаўнай акцыяй: Беларускі Банк, Т-ва Белар. Школы і Грамада. На чале гэтых штабаў сталі адны і тыя самыя асобы-камуністы. Пад упывам агітацыі гурткоў, люднасьць варожа адносілася да камасацыі (падзел на хутары).

Абарона і абвінавачаныя задаюць цэлы шэраг пытаньняў. Адв. Крыжаноўскі — хто належаў да ўраду Т-ва Белар. Школы ў Глыбокім? Сьв.—Мятла, Вера Дрозд і Скурка. Крыжаноўскі: а хто быў старшынёю філіі Белар. Банку ў Глыбокім? Сьв.—Сакалоўскі, але над ім была Рада Надзорчая. Крыжаноўскі: што Банк рабіў з даўжнікамі? Сьв.—ня ведаю. Праф. Пятрусэвіч: сьведка ня чуў, што каморнік прадаваў маемасьць даўжнікоў і што перарыў у экзэкуцыі быў выкліканы толькі тым, што ўсе кнігі былі ў судзьдзі сьледчага? Сьв. — ня чуў. Адв. Гонігвіль: што лучыла Івашкевіча з Юдзенкам (Івашкевіч у дзень забойства спаў у хаце Юдзенка)? Можа Юдзёнак быў канфідэнтам паліцыі? Сьв.—я аб гэтым ня ведаю. Абв. Астроўскі—ці былі агульныя пасяджэньні ўсіх сяброў філіі Белар. Банку ў Глыбокім? Сьв.—было адно.

Абв. Мятла—ці быў Старас. паведамлены аб складзе гурткоў? Сьв.—часткова быў.

Адв. Абрамовіч: ад каго сьведка даведаўся аб сходзе ў дню 29./XII. 1926 г. у Друі на якім быў Мятла? Сьв.—ад Ласёнка, канфідэнта пал. Адв. Прайс—сьведка казаў аб трох штабах, якія складаліся з тых самых асобаў. Чым сьведка тлумачыць гэтакую неасьцярожнасьць кіраўнікоў? Бо хіба-ж кожнаму ясна, што ў прыпадку ліквідацыі аднаго са штабаў—зьліквідаваліся-б гэтым самым і два пазастаўшыяся? Сьв.—ня ведаю.

Сьв. Антаневіч — ведае абв. Антановіча Аляксандра, які быў у Расеі аж да 1922 года. У Польшчу вярнуўся нелегальна. На сходах гуртка ў в. Княгініне казаў аб арганізацыі Беларусі. Іншы сябра Грамады — Падбярэцкі нагаварваў сьведку, каб запісаўся ў Грамаду. Пракур. Калапскі — ці ня мелі вы спораў з грамадаўцамі? Сьв.—меў, грамадаўцы падазравалі мяне, што я канфідэнт. Шэўчык меўся навет выдаць на мяне вырак сьмерці. Грошы на арганізацыі прыходзілі з Расеі.

Адв. Сьмяроўскі — скуль пан ведае аб грашох з Расеі, аб праектаваным забойстве пана і г. д.? Сьв. — я даў слова не казаць, хто гэта мне гаварыў. Адв. Сьмяроўскі: а пан жа прысягаў сказаць усё? Сьв.—Ніколі гэтага не скажу.

Абв. Антановіч — сьведка казаў, што я быў да 1922 г. у Расеі, а ці не адбіралі вы ў мяне бесьпадстаўна ў 1920 г. пры бальшавіках зямлі, як ад гандляра, не працоўнага элемэнта? Сьведка прызнаецца, што адбіралі.

Сьв. Маліноўскі, канфідэнт, кажа аб Антановічу і нічога новага да справы ня ўносіць.

Сьв. Высоцкі Каз. абшарнік, кажа аб Антановічу, які быў актыўным грамадзістам. Сьведка няраз зьвяртаўся да Антановіча, каб ён сваю працу пакінуў і грэзіў, што ў праціўным выпадку ён зробіць усё, што можа, каб Антановіча пасадзіць у турму. Адв. Сьмяроўскі — ну і што ж зрабіў пан, што мог? Сьв.—зрабіў. Адв. Сьмяроўскі,—а што сьведка зрабіў? Сьв.—гэтага ніколі не скажу. Адв. Сьмяроўскі—дык вольна мне дадумвацца, хто пан такі? Сьв.—не адказвае.

Сьв. Коўшыц Сымон — быў войтам у Лябёдзкай гм. і заўважыў труднасьці пры спаганяньні падаткаў. Вінцук Салыга належаў да Грамады і арганізаваў гурткі на абшары

гміны. У воласьць прыходзіла многа белар. газэтаў, але яны, на падставе распараджэньня старасты, зьнішчаліся. Сьмяроўскі—усе беларускія газэты нішчыліся? Сьведка спахватываецца і кажа, што распараджэньне датычылася толькі газэтаў сканфіскаваных.

Сьв. Боровіч, пал. у кастрычніку зьявіўся да сьведкі нейкі чалавек, які цьвердзіў, што на адным сходзе гуртка ў Княгініне Антановіч казаў аб злучэньні ўсіх беларусаў і аб падатках, як і аб тым, што Грамада атрымлівае грошы ад Расеі. Дысцыпліна сярод грамадаўцаў была вельмі моцная. Антановіч: ці чулі, як я на ўсіх сходах казаў, што праца Грамады ёсьць легальнай?

Сьв.—Так.

Сьв. Толстыко Міхал—сам паведаміў паліцыю аб сходзе ў в. Жарах, на якім Антановіч казаў аб неплачэньні падаткаў. Прысутных на гэтым сходзе было каля 50 асоб. Адв. Сьмяроўскі — ці сьведка ведае каго з тых, хто быў на гэтым сходзе? Сьв. — не. Адв. Сьмяроўскі—а дзе сьведка жыве? Сьв. у в. Цэрашках, 9 вёрст ад Княгініна.

Сьв. Пугала, кам. пал. Вялейскага пав. Вучань Белар. Гімназіі Хоўчык арганізаваў гурткі. На павятовым зьезьдзе ў Вялейцы, на якім быў прысутным і пасол Тарашкевіч, старшынёю пав. камітэту быў выбраны Антановіч. Заўважыў, што да Грамады ішлі і камуністы. У лютым 1927 г. атрымаў вядомасьць, што нейкая асоба прынясла з заграніцы 2.000 даляраў, з якіх Антановіч атрымаў 50, а рэшту павятовы камітэт Грамады. Адв. Эттінгэр—на якую акцыю былі асыгнаваны гэтыя 2.000 дал. — на палітычную, ці на шпіёнскую? Сьв. — ня ведаю. Адв. Сьмяроўскі—дзе знаходзіцца тая асоба, якая дала пану інфармацыі аб 2 000 даляраў?

Сьв.—На вольнасьці. З гэтае прычыны адв. Сьмяроўскі просіць Суд паклікаць гэную асобу ў характары сьведкі. Суд адмаўляе, матывуючы сваю адмову тым, што гэта асоба ёсьць западозраная ў шпіёнстве і да высьвятленьня пазастане на вольнасьці. Адв. Сьмяроўскі пратэстуе проці гэтак далека ідучага абмежаваньня правоў абароны; тут у Судзе ёсьць канкрэтнае абвінавачаньне Антановіча ў атрыманьні грошы з заграніцы, там-жа, на вольнасьці, знаходзіцца асоба, якая можа высьвятліць гэтую справу і якая ня можа быць паклікана на Суд дзеля таго толькі, што ў прышласьці можа быць арыштавана.

Сьведка сцьвярджае далей, што сябры Грамады плацілі даволі значныя сяброўскія складкі (ад 5—10 зл.). Здараліся выпадкі, што паасобныя сябры ўносілі і па 100 зл.

Абв. Акінчыц: ці ўдалося сцьвярдзіць, што гурткі ўтрымлівалі адносіны з бальшавіцкімі ўладамі? Сьв. — Канкрэтнага нічога ня ведаю. Акінчыц просіць Суд сцьвярдзіць, паказаньне сьведкі ў судзьдзі сьледчага, дзе ён выразна казаў, што бальшавікі выкідвалі грамадаўцаў ізноў да Польшчы. Акінчыц— ці ўдалося пану выкрыць існаваньне „bojówek" і аружжа ў грамадаўцаў? Сьв.—не.

Тарашкевіч: скуль сьведка ведае, што я быў на пав. зьезьдзе ў Вялейцы? Сьведка—я гэтага ня ведаю. Абв. Тарашкевіч просіць Суд зьвярнуць увагу на паказаньні такіх сьведак, якія аб фактах, ня меўшых ніколі месца, кажуць пэўна, што яны былі.

Сьв. Шадзінскі Ян—пал. быў на сабраньні ў в. Ліпках, на якім прамаўляў Антановіч. Ен казаў толькі аб белар. школах, асадніках, вялікіх падатках і патрэбе легальнае барацьбы за лепшую долю.

Сьв. Яцэвіч быў на сабраньні ў в. Касьцілаўцах, на якім абв. Салыга чытаў праграму Грамады. Была мова і аб мэтах, але сьведка не зразумеў, што гэта мае азначаць. Апрача гэтага, Салыга казаў аб патрэбе бел. школаў, падкрэсьліваючы адначасна, што ён не працуе за бальшавіцкія грошы, а толькі за свае. Абв. Салыга, ці казаў я, што мы з камуністамі ня маем нічога супольнага, што трэба ісьці легальным шляхам, што трэба складаць дэкляярацыі на бел. школу? Сьв. Аб гэтым казаў. На сабраньні быў прысутны паліцыянт. Тое самае пацьвярджае і сьведка Субач.

Паказаньні сьведкаў Фэргэля Стан. і Мазуркевіча, пал.—ня цікавы.

29 дзень працэсу Грамады. 12. IV. 28 г.

Сьв. Білевіч—Антановіч стараўся закладаць гурткі на абшары Дзьвінаўскае вол., але гэта яму не ўдавалася. Пад уплывам агітацыі з Крывіцкае вол. перасталі ўплываць падаткі. З агітацыяй аб паўстаньні не спатыкаўся.

Адчытываюцца паказаньні сьведкаў Пацыны і Рудзя Васіля, з якіх першы восеньню 1926 г. бачыў Салыгу каля царквы сярод 10 асоб, прамаўляючага да іх, другі кажа аб Куліне-Кулікоўскім, што ён імкнуўся да адарваньня Зах. Беларусі ад Польшчы і далучэньня да Усходняе.

Сьв. Грабоўскі Ян — паруч., чуў аб прыгатаўленьнях да паўстаньня ад палуладнага афіцэра. Мятла быў на сабраньні ў Чарапах, дзе сказаў, што гадзіны паўстаньня дакладна азначыць ня можна. Грамадаўцы „шпегавалі" і пад уплывам іх агітацыі павялічылася дэзэрцыя. На адным сабраньні апрацавана плян, як ажакаваць стражніцу...

Адв. Дурач: ці сьведка можа сцьвердзіць, што усе, якія шпіёнілі, належалі да Грамады? Сьв.: гэтага сцьвердзіць не магу. **Дурач**: а ці дэзэртыравалі толькі беларусы? Сьв. Не, палякі таксама, але беларусы больш. **Абв. Мятла**—калі я быў у Чарапах? **Сьв.** ня ведаю. **Мятла**: асьвядчаю, што ў гэтай вёсцы я ні разу ня быў.

Сьв. Тамашэвіч Вац. пал., быў на сабраньні гуртка ў Касьцілоўцах, на якім Салыга казаў аб беларускіх школах, аб арганізацыі і аб нейкіх межах; успамінаў і аб самастойнай Беларускай Дзяржаве.

Ясюкевіч, солтыс, быў таксама на сабраньні ў Касьцілоўцах. Чуў, як Салыга казаў аб межах, але не зразумеў гэтага; аб Незалежнай Беларусі Салыга нічога не казаў.

Сьв. Падліпны — пал. кажа, што Салыга скончыў камуністычную школу, але ня ведае, дзе і калі. Абарона ўстанаўляе, што Салыга скончыў 6-месячную тэхнічную школу ў Расеі.

Сьв. Каштан Янка быў на сабраньні ў Касьцілоўцах. Салыга казаў аб бел. школах. **Салыга**: а ці казаў я, што, калі мы скасуем межы на палёх і пяройдзем на хутары, дык будзем лепей жыць? **Сьв.** — Так, гэта казаў.

Сьв. Матэрна, канфідэнт — сачыў грамадаўцаў на абшары Лебядзёўскае вол. Аб Салыге ведае, што ён ангажаваў сяброў да Грамады. Настрой у воласьці быў няпрыязьны да Польшчы.

Адв. Эттінгэр: у чым выяўлялася гэтая няпрыязьнасьць? **Сьв.**—ня ведае. На пытаньні прак. Калапскага сьведка адказвае, што камуністы—Руды Сымон і Мацюк былі ў урадзе гуртка ў в. Малышох.

Абв. Салыга: асьвядчаю Высокаму Суду, што Мацюк і Руды сябрамі Грамады не былі і што ў Малышох ніякага гуртка не было.

Сьв. Махоцкі, пал., кажа, што ў сувязі з арганізацыяй ў 1926 г. „kółek PPS" Салыга, на пытаньне сьведкі, што ён аб гэтым думае, адказаў: усё гэта глупота, лепей узяць у рукі карабін. Салыга мянаваўся старастам. Дамагаўся беларускіх школаў, мець іх было вельмі многа.

Тарашкевіч: колькі беларускіх школаў ёсьць у панскім павеце? Сьведка не адказвае. Тарашкевіч паўтарае зноў тое самае пытаньне па-беларуску. Сьведка: nie rozumiem.

Тарашкевіч: як-жа пан, не разумеючы беларускае мовы, можа казаць што гаварыў Салыга? **Сьведка**—trochę rozumiem. На пастаўленае ізноў Тарашкевічам тое самае пытаньне пан[illegible] сьведка маўчыць.

Тарашкевіч: калі-ж мы скончым гэтую камэдыю? **Старшыня Суда**: „milczeć, wyprowadzić go do więzienia". Тарашкевіч забірае свае нататкі і выходзе, тлумачучы, адначасна, што ён сказаў гэта аднасна сьведкі, а ня Суда. Па выхадзе Тарашкевіча ўстае абв. Бурсэвіч і просіць вывесьці і яго. Падчас задаваньня абаронай пытаньняў сьведцы, усе падсудныя ўстаюць са сваіх месц. На загад старшыні Суда „siadać"—ніхто не садзіцца.

Старшыня перарывае паседжаньне. Камэндант варты зрабіў трывогу. З бакавых дзьвярэй улятае многа ўзбраёных паліцыянтаў, якія акружаюць абвінавачаных і выдаляюць публіку з салі. Трывожны настрой панаваў у працягу ўсяго перарыву, які цягнуўся добрых паўтары гадзіны.

Абаронцы выбралі з пасярод сябе дэлегацыю ў складзе праф. Пятрусэвіча, адв. сэн. Крыжаноўскага і адв. Гонігвіля, якая канфэравала пачарадзе з Судом і абвінавачанымі. Памалу інцыдэнт ліквідуецца і паседжаньне Суда аднаўляецца ізноў, прыблізна каля гадз. 4. На лаўках абвінав. ня відаць Тарашкевіча і Бурсэвіча. **Праф. Пятрусэвіч** ад імя абароны просіць Суд спыніць сяньнешняе паседжаньне дзеля агульнага змучаньня. **Адв. Гонігвіль**, апрача гэтага, просіць Суд паклікаць на наступны дзень абв. Тарашкевіча і Бурсэвіча. Суд згаджаецца.

30 дзень працэсу Грамады 13.IV 28 г.

Сьв. Сасноўскі Цэл. канфідэнт Лідзкага павету. На пав. зьезьдзе гурткоў нав. старшынёю выбраны быў Салыга, які імкнуўся да адарваньня Зах. Беларусі ад Польшчы, а Усходняе ад Расеі і стварэньня з іх Незалежнае Дзяржавы Беларускае. Некаторыя сябры Грамады вялі камуністычную дзейнасьць і былі за гэта арыштаваны, як напрыклад Мацюк Сымон, Пракаповіч і іншыя. Па ліквідацыі выясьнілася, што Цэнтральны Сакр. Грамады меўся ўзяць у свае рукі кіраўніцтва бел. рэвал. рухам. Выясьнілася гэта са знойдзенага лісту да Цэнтр. Сакр. падпісанага лічбай, якраз адпавядаючай нумару сяброўскае легітымацыі абв. Крупіцы, які быў старшынёю гуртка. Чуў аб маючым быць на вясну паўстаньні і аб 30.000 войска, якое дапаможа паўстанцам. Абарона высьвяе, што ліст аб якім сьведка гаворыць, зьмяшчаў толькі пратэст проціў арыштаваньня паслоў Мятлы і Валошына.

Адв. Бабянскі — ці і каталікі належалі да Грамады? **Сьв.** — так. **Рак-Міхайлоўскі** — скуль сьведка ведае аб паўстаньні і аб 30.000 войска? **Сьв.** — prowadziłem badania і больш нічога не дадае.

Сьв. Шаулюк пал., кажа аб Шымковічу, які арганізаваў сабраньні ў Ліпнішках і меўся быць старастай. Гурток у гэтай вёсцы заламыў Рак-Міхайлоўскі.

Абв. Рак Міх. — калі быў арганізаваны гурток у вёсцы Ліпнішках? **Сьв.**—16.IV 26 г. **Рак-Міх.** — асьвядчае, што гурток у Ліпнішках быў з'арганізаваны без яго і што ён прыяжджаў у гэтую вёску ўжо падчас існаваньня там гуртка.

Сьв. Сальмонскі В., пал., з гм. Радашкоўскае. Чуў аб тым, што грамадаўцы дамагаліся падзелу зямлі, зьбіралі грошы на палітычных вязьняў, трэбавалі белар. школаў. Сябры Грамады ахвотна, прымаліся заграніцай. Меў ведамасьці аб тым, што Р. Астроўскі, будучы ўлетку 1925 г. у Улаваа, спатыкаўся там часта з жыхаром в. Чэрамісаў, Вітkоўскім, бальшавіцкім шпіёнам. Спатканьні адбываліся ў кустах, каля афіцыны, у якой затрымліваўся Астроўскі. Віткоўскі быццам даручыў тут Астроўскаму грошы на віленскую гімназію і камуністычную агітацыю. Сябры Грамады атрымлівалі газэты бясплатна. **Адв. Эттінгэр** — ці сьведка сам бачыў, як Астроўскі атрымліваў грошы ад Віткоўскага? **Сьв.** — не, бачылі іншыя, але я пазнаў Віткоўскага па апісах. **Абв Астроўскі**—ці сьведка таксама казаў і ў судзьдзі сьледчага? **Сьв.** — не. **Астроўскі** — а матэрыялы проці мяне ўжо меў? **Сьв.** — меў... Вытлумачыць адзак-жа, чаму казаў інакш, ня можа. **Абв. Рак-Міхайлоўскі** — сьведка казаў, што газэты атрымліваліся бясплатна. А ці ведама сьведцы, што некаторыя сябры акуратна плацілі за газэту? (пры гэтым падае прозьвішчы многіх сяброў з Радашкоўскае гм. плаціўшых акуратна грошы за падпіску). **Сьв.** — не, ня ведаю... **Адв. Эттінгэр**— ці абітурыенты беларускіх гімназіяў мелі даступ на віленскі ўнівэрсытэт? **Сьв.**—ня ведаю.

Абв. Акінчыц просіць Суд прыняць 150 зл. на наклікаьньне вельмі важнага для яго сьведкі Гірша.

Сьв. Масюлевіч Я., паруч, паказвае пры зачыненых дзьвярох.

Сьв. Ціхоцкі, пал.—Грамада заклікала да закладаньня гурткоў, „масова" ўсувала солтысаў і вучыцялёў, імкнулася да злучэньня з Усходняй Беларусьсю. „Масова" распаўсюджывалася падбураючая да адарваньня ад абшарнікаў зямлі літэратура. „Масова" палілі стадолы. Сябры камуністычнае партыі належалі да кіраўнікоў. **Абв. Куліна-Кулікоўскі** ўстанавіў сувязь з Расеяй, але пры дапросе да гэтага ня прызнаўся. Сябра Грамады Ігнатовіч Барыс меўся быць маладэчанскім старастай. Абітурыентам белар. гімназіяў былі выдаваны, апрача дакуманту аб сканчэньні гімназіі, — пропускі заграніцу. Бальшавікі прыймалі толькі тых, якія гэтакія пропускі мелі; тых-жа, якія ня мелі, выкідывалі ізноў у Польшчу, як напрыклад нейкую Смалонскую Марыю. Выдачай пропускаў займаўся Астроўскі разам з цяперашнім паслом Гаўрылікам. 19.IX 26 г. адбыўся пав. зьезд гурткоў у Маладэчне, на якім была абгаварывана арганізацыя „bojówek" і заклікана люднасьць да ўступленьня ў Грамаду. Ігнатовіч атрымаў пазычку з Бел. Банку ў высокасьці 180 даляраў. Рэвізія ў белар. гімназіі ў Радашкавічах нічога не дала, знойдзена толькі многа грамадаўскае літэратуры. Менск быў базай для прышлага паўстаньня.

Абарона засыпае сьведку пытаньнямі, па якіх выясьняецца, што нічога „масовага" нідзе ня было. Толькі ў адным выпадку людласьць зьвярнулася да інспэктара, каб звольніў неадпаведную вучыцельку, ды ў іншай зноў вёсцы выбрана новага солтыса. Пры рэвізіі ў бел. гімназіі ў Радашковічах знойдзена ў бібліятэцы „Прамовы паслоў" і „Нашу Справу".

Адв. Эттінгэр: скуль пан ведае, што Астроўскі выдаваў прапускі ў Менск? **Сьв.**—ведаю гэта ад быўш. вучня Талстова (у наступных справаздачах выясьніцца, што такога вучня ніколі ня было), які сядзеў за некалькі дзён перад адасланьнем яго з Расеі з нейкім Янчуковічам, б. вучнем бел. гімназіі, які хутка быў звольнены, дзякуючы таму, што меў гэтакі пропуск.

Адв. Эттінгэр — зачым-жа быў выдазаны гэтакі кампрамітуючы дакумант, калі можна было даць добрую апінію проста на цэнзурцы вучнёўскай? Як пан гэта выясьняе? **Сьведка**—замінаецца. **Старшыня Суду Аўсянка**—ўхіляю гэта пытаньне.

Адв. Эттінгэр — прашу Суд запратакажаваць мае пытаньне.

Рак Міхайлоўскі сьведка казаў, што камуністы займалі важныя становішчы ў Грамадзе. Можа сьведка вылічыць некалькі прозьвішчаў гэных камуністаў.

Сьв. Ігнатовіч, Пятровіч.

Рак-Міхайлоўскі — а ці ведама сьведцы, што ён цяпер выбраны войтам і што староста яго зацьвярдзіў? **Сьв.** — вядома...

Рак-Міхайлоўскі — а ці вядома сьведку, што маладэчанскі зьезд не адбыўся, бо ня быў дазволены старастай. **Сьв.** — вядома.

Далей сьведка кажа, што ў Паставах на мітынгу, скліканым Тарашкевічам, была вынесена гэткая рэзалюцыя ў форме пытаньняў: „ці хочаце служыць у войску? не; ці хочаце плаціць падаткі? не; ці хочаце скасаваць паліцыю? хочам. Гэткае сфармуляваньне рэзалюцыі вельмі зьдзіўляе ўсіх, асабліва абарону і выклікае асьвядчэньне Тарашкевіча, што на мітынгу гаварылася толькі аб зьмяншэньні войска, паліцыі і падаткаў, адпаведная ж рэзалюцыя надрукавана ў газэтах і зьмест яе можна лёгка спраўдзіць...

Сьв. Лукоўскі Ян, пал. кажа аб забойстве Івашкевіча, якое адбылося ў хаце Юдзёнка, старшыні валаснога гуртка. Прычынай забойства было тое, што Івашкевіч выкрыў шпіёнскую шайку на карысьць бальшавікоў, правадыром якой быў нейкі Селянік. Забойства выканалі Юдзёнак і два Карніловічы — Янка і Дзям'ян, якія ўсе тры ўцяклі ў Расею. Хадзілі пагалоскі, што бальшавікі абяцалі за забойства Івашкевіча 3 — 4 тысячы рублёў. **Адв. Эттінгэр**: ці Юдзёнак не працаваў у характары канфідэнта? Сьведка ня памятае. **Адв. Эттінгэр** просіць Суд сцьвярдзіць, што сьведка ў судзьдзі сьледчага казаў аб Юдзёнку, як аб пэўным канфідэньце, які ўдаючы чыстага камуніста здраджаў адначасна камуністычны рух. Сьведка спраўдзіў гэта ў камандзе паліцыі сам асабіста. Дзеля гэтых прычын адв Эттінгэр просіць Суд паклікаць паўторна сьв. Скальскага, які-б мог гэта сцьвердзіць. Суд не згаджаецца.

Далей ідзе цэлы рад сьведкаў у справе забойства канфідэнта Івашкевіча ў в. Сьценцы. Усе яны, як адзін, сцьвярджаюць, што забілі яго Юдзёнак і Карніловічы Янка і Дзям'ян, якія зараз-жа ўцяклі ў Расею.

Е. Сэдрацкая.

Дзьве галавы.

Сумна цягнецца яе адзінокае жыцьцё... Памалу плывуць сумныя зімовыя дні... Шэрае неба зьліваецца разам з шэрымі сьценамі. На ўсім ляжыць вялікі смутак: на зялезным ложку, паламаным крэсьле і стале, на кнігах бяз вокладак, а яна таксама акутана шэрым туманным ценем.

Яна глядзіць у люстэрка і бачыць цёмныя кругі навакол яе чорных сумных вачэй, змучаную хваравітую хварбу, каторая разьліваецца па ўсім твары, і яна робіцца яшчэ смутнейшай: сэрца ные і абліваецца беднай крывёю яе твар... Даўжэйшай робіцца зімовая ноч, даўжэйшай і сумнейшай пры сьвеце малой лямпачкі. Яна нікога не чакае і ніхто да яе ня прыходзіць. Яна адарвалася ад сьвету.

Калі ўнізе пачало ўсё кіпець, што вокны яе хаткі пачалі дрыжэць ад вулічнага шуму, яна абудзілася, пакінула свой кніжны сьвет і кінулася ў кіпучыя хвалі. Але было за-позна... Хвалі яе не прынялі. Гарачай веры вымагалі... У яе гэтага ня было.

Яна вярнулася яшчэ сумнейшаю. У пакоі сядзіць яна адна пры бледным сьвеце сваёй лямпачкі, паміж ценямі, каторыя дрыжаць на сьценах; адзінокая і бяз мэты да жыцьця.

Адноўчы яна пачула сьмех за сьцяной. Суседні пакой да гэтага часу стаяў пусты, а цяпер нехта заняў яго і—сьмяецца!

Яе гэта нэрвуе: навакол такое адзіноцтва—а там сьмяюцца! Яе худыя рукі працягнуліся... Яна пастукала ў сьцену... стук-стук стук... ёй здаецца, што яна кажа гэтым так... „маё сэрца баліць... памажэце мне, спачувайце мне"..., а з таго боку адклікнулася, як рэха: „стук-стук-стук"—справядліва, справядліва! і сьмех спыніўся.—І з таго часу яна пачала часьцей стукаць у сьцену... стук-стук стук... гэта значыла: як цяжка на сэрцы, як сумна на душы", стук-стук-стук, адклікаецца з таго боку, а гэты адказ значыць: „І мне!" „І мне"!" „І мне"! — „стук-стук-стук" — як цягнецца беднае жыцьцё... Як хочацца для чаго-небудзь жыць"... „І мне! І мне! І мне! адказываюць з таго боку...

„Той таксама мусіць адзінокі", уздыхае яна і пачынае думаць аб ім.

Адзінокі там—мусіць жыве... Яна хоча, каб ён называўся „Лазар", бо яна любіць гэта імя... Колькі ён мае год? Мусіць 25! Росту мусіць быць высокага, стройнага, твар бледны... далікатныя рысы... валасы залатыя, кучаравыя, троху раскіданыя... асабліва каля лоба. Вочы мусіць мець сінія, вялікія, задумчывыя... і яны так дзіўна глядзяць з пад густых броваў.

— „Як ён жыве„? Яго пакой, мусіць, такі самы шэры і сумны, як і яе... кніжак і там пэўна шмат... таксама бяз вокладак! А ён чытае... дзень і ноч ён чытае. І чытае ён з запалам... нэрвова... так, як-бы ён вялікія багацьці згубіў... згубленыя драгацэннасьці... сьвятасьці... каторыя ён ня можа знайсьці... на ягоным лобе кладуцца маршчыны, што раз то робяцца глыбейшымі і глыбейшымі... сінія вочы робяцца сумнейшымі... больш задумчывымі...

І незнаёмае пачуцьцё ахоплівае яе... яна шкадуе яго... так адзінока!..

Яна чуе праз сьцену, як ён уздыхае... вось, здаецца ёй, бачыць яна яго праз сьцену, слёзы льюцца з ягоных вачэй на бледны твар...

Чаго яму не хапае? Ад чаго ён мучыцца? І яна прыціскае свой лоб да халоднае сьцяны; хай сьцяна раскажа ёй нешта аб ім... а гэта пачуцьцё расьце і ахоплівае яе ўсё больш і больш...

У душы расьце такі дзіўны сум... і слёзы капаюць цёплыя... і здаецца ёй, што нешта халоднае таець у яе душы... нешта цяжкое на сэрцы робіцца такім лёгкім. Ужо ня цісьне так, а робіцца лёгка... а жаласьць на самотнага суседа расьце. Ей хочацца быць каля яго... Яна-бы так ахвотна сьлёзы з ягоных вачэй цалавала-б... З яе далікатнымі рукамі локаны папраціла-б... па галаве гладзіла-б... яна-б глядзела яму ў вочы так добра, як сястра... Яны напэўна-б пакахаліся-б... разам, лягчэй было-б жыць, знайсьці мэту жыцьця...

У яе стук у сьцену робіцца мягчэйшым, далікатнейшым, і з таго боку адклікаюцца тоны поўныя надзеі, пацехі і любові, яна хоча яго бачыць... Яна сумуе... але ісьці да яго яна ня хоча... У кніжках робяць так, але ў жыцьці цяжка, яна ня можа... летам яна-б вакно адчыніла і ён таксама...

І новыя залатыя сны прабуджаюцца ў яе... хай пакажацца першае сонца! Тут праз вакно, ёй пакажацца, яго залатая галава!

А калі прыйшла вясна і на шэрых сьценах, на бедным ложку, разлажыліся залатыя касулі—яе сэрца прыемна ўздрыгнула... радастны „стук-стук-стук... „Вясна кліча да каханьня, да жыцьця, да шчасьця". А з таго боку адклікнулася: „І мне, і мне, і мне" і ціха кладзе яна руку на сумуючыя грудзі... з салодкімі сьлязамі і сумуючымі вачыма!— „І мне, і мне, і мне"! І яна адчыніла вакно!— І яна чуе, што і там, там таксама.—І запраўды, не яна адна высоўвае галаву... Дзьве галавы разам паказаліся ў вакне... два бледных, сумуючых твары, дзьве пары сумуючых вачэй... але дзьве дзявочыя галавы!

Паказаньні сьв. Казачонка Янкі, з гэтай-жа грамы, простага селяніна, не згаджаюцца з паказаньнем яго ў судзьдзі сьледчага, дзе ён казаў аб нейкіх канфэрэнцыях і падпісаў уласаручна пратакол. Гэта вызывае са старэны адв. Эттінгра пытаньне: ці сьведка разумее, што такое канфэрэнцыя? Сьв. — замінаецца. Адв. Эттінгэр: можа гэта мужчына або жанчына? Сьв.—а хто яе ведае...

Сьв. Клімовіч Ігнат—належаў да Грамады і быў старшынёю гуртка ў в. Васюльках. Знае добра Антановіча Алякс., які заўсёды казаў, што Грамада змагаецца легальна. Ніякіх сабраньняў нелегальных ні было. Апошнее сабраньне адбылося 10. І. 27 г., на якім Антановіч казаў, што Пілсудскі павінен зразумець беларускія балячкі і навучаў сяброў, каб працавалі толькі легальна. Складкі сяброўскія ўплывалі акуратна. Газэты атрымлівалі паасобныя сябры, якія плацілі падпісныя грошы.

Сьв. Дзятлік, у памешканьні якога адбылося сабраньне 10. І. 27 г., сьцьвярджае, што паліцыя прышла на сабраньне раней, чым Антановіч і дзеля гэтага ў той дзень не магло быць ніякіх нарадаў нелегальных, якія быццам рабіў Антановіч перад самым адчыненьнем сабраньня.

Замах ці правакацыя?

12 красавіка раніцай — у часе адчыненьня выстаўкі і кірмашу ў Мілане на шляху, дзе меў праехаць кароль, узарвалася вялізарнай сілы „пякельная машына". Выбухам бомбы забіта 22 і ранена каля 50 асобаў. Кароль з сьвітай спазьніўся на 7 мінутаў, дык дзеля таго быў адратаваны ад немінучай сьмерці.

Абставіны замаху—надзвычай падазроныя.—Бо-ж, ня гледзячы на надзвычайныя меры аховы (100 паліцыянтаў дзяжурылі на пляцы, дзе ўзарвалася бомба, усю ноч, навакол на ўсіх дахах былі схаваны паліцыянты і г. д.) нявыкрытыя замахоўцы здолелі падлажыць машыну ў лёхаль электрычнай латарні. Урад, магістрат Мілану і розныя арганізацыі вызначылі значныя сумы таму, хто паможа раскрыць віноўнікаў замаху. Газэты пішуць, што гэта—анархісты, іншыя газэты толькі-што пусьцілі чуткі, быццам гэта зрабілі агенты... тырольскіх немцаў, якія памсьціліся такім чынам за гвалты фашыстаўскай улады ў краі. Цікава, што ў той самы час падобны-ж замах зроблены і на самога Мусоліні, які цягніком ехаў на тую-ж выстаўку ў Мілан. Але тут усё абышлося, — як заўсёды з усімі „замахамі" на жыцьцё Мусоліні: бомба была выкрыта, як-раз у патрэбны час, знойдзены „замахоўец", які сядзеў у вакрыцьці пад рэльсамі і т. д. Эмігранцкая італьянская прэса цьвердзіць, што Мусоліні і цяпер, як заўсёды, сам арганізаваў на сябе замах... Цьвердзіць навет, што і пакушэньне на караля таксама арганізавана фашыстаўскай „ахранкай". Каму верыць тут, няма ведама. Ведама толькі, што ў апошнія часы запраўды-ж адносіны паміж каралём і Мусоліні страшэнна папсаваліся—да таго, што пайшлі навет чуткі, быццам кароль мае намер зрачыся трону на карысьць свайго сына. А гэты сын, як ведама,—вельмі варожа адносіцца да Мусоліні,—ня толькі не баючыся яго, як яго вельмі трусьлівы бацька, але галосна цьвердзіць, што як дойдзе да каралеўскай улады, дык першым чынам выжане вон Мусоліні. Былі весткі, што паміж гэтым наступнікам трону і Мусоліні быў навет паедынак, на якім быццам Мусоліні быў ранены.

Сьледзтва ў справе замаху на караля вядзецца пад асабістым кіраўніцтвам Мусоліні—„з усей энэргіяй". Але вынікаў ніякіх дагэтуль няма. Амаль ня ўся процi-фашыстаўская, а пераду ўсім сацыялістычная, прэса выразна падазравае, што замах зьяўляецца чарговай правакацыяй фашызму, які ўсьцяж патрэбуе „паводаў" дзеля далейшых рэпрэсіяў і тэрору процi апазыцыі.

Так тлумачыць замах навет польскі „Робoтнік". Як ведама, сам Мусоліні таксама ўзяў на сябе „найвышэйшае кіраўніцтва" сьледзтвам у справе забойства пасла Маттэотті, асабліва—пасьля таго, як высьветлілася з паказаньняў беспасрэдных спраўцаў праступленьня, што забойства было арганізавана бліжэйшымі супрацоўнікамі самога Мусоліні—з ведама апошняга.

Тэлеграмы кажуць, што сьледзтва страшэнна затруднена тым, што замахоўцы прынялі рашучыя меры, каб пусьціць на фальшывыя сьляды дзеяльнасьць паліцыі і сьледчай улады. Сьперша газэты пісалі, што агульная апінія віноўнасьць у замаху анархістаў ці процi-фашыстаўскія арганізацыі. Але дадавалі, што калі-б замах зрабілі антыфашысты, дык пэўне ня процi караля, якога наадварот апазыцыя мае надзеі выкарыстаць процi Мусоліні. — Бо ж ведамы яго дрэнныя, але толькі хаваныя ад усіх, адносіны да фактычнага „караля" Італіі. А вось, апошнія тэлеграмы кажа ўжо, быццам знойдзены ды арыштаваны нейкі хлапчук, у якога знайшлі нейкі падазроны плян пляцу з рознымі адзнакамі. Хлапчук мае фальшывы пашпарт і належыць да камуністычнай партыі Італіі.

Італьянскае пасольства ў Варшаве афіцыяльна заявіла прадстаўнікам прэсы, што замах, як відаць з абставінаў здарэньня, скіраваны быў выключна процi караля, але ня процi Мусоліні, які навет ня меў намеру прымаць удзелу ва ўрачыстасьцях у Мілане. „Аднак-жа замах на караля зьяўляецца актам процi-фашыстаўскага тэрору, дык дакананы камуністамі ці сацыялістамі (?!)... Мэтай замаху было—паказаць, што ня гледзячы на рэпрэсіі з боку ўраду, процi-фашыстаўскі рух у краі існуе". Але-ж процi-фашыстаўская сацыялістычная прэса падчырківае, што караля ў краі зусім ня вінаваціць у фашыстаўскіх гвалтах, але лічыць самога згвалчаным Мусолінім. Як ведама, кароль заўсёды жыў у добрых стасунках з італьянскімі сацыялістамі, якія навадыры яшчэ перад вайной зьяўляліся навет да караля на афіцыяльныя прыняцьці ў яго палацы. Гэта, як прыпамінаюць цяпер газэты, выклікала тады першы раз страшэнную сэнсацыю ў сацыялістычным сьвеце. Сацыялісты, як марксісты, не прызнаюць асабістага тэрору, як спосабу рэвалюцыйнай барацьбы, веручы толькі ў шырокі масавы арганізаваны рух. Гэтым гэтыя партыі адрозьніваюцца, паміж іншым, ад сацыялістаў-рэвалюцыянэраў і анархістаў, якія, так зван. „індывідуальны" (асабісты) тэрор кладуць у аснову сваей рэвалюцыйнай акцыі.

Цяпер, як высьветлілася, вестка, пушчаная швайцарскай прэсай аб зробленай быццам адначасна з замахам на караля спробе такога-ж замаху і на цягнік, у якім ехаў Мусоліні, аказалася фальшывай. Ніякага замаху на Мусоліні ня было. Паважная венская газэта „Нэйе - Фрайе - Прэссэ" („Новая Вольная Прэса") кажа, што няма ніякіх падставаў тлумачыць замах на караля барацьбой антыфашыстаў з фашыстамі. — Дык усё больш галасоў на тое, што замах—правакацыя фашыстаў...

Палітычная хроніка.

У Польшчы.

Працэс б. паслоў „N. P. Ch.".

„Głos Prawdy" № 108 падае, што сьледзтва процi б. паслоў „N. P. Ch.", Галавача і Фідэркевіча — закончана. Разам з імі праўдападобна будуць пацягнуты да судовай адказнасьці некалькі іншых дзеячоў „N. P. Ch.".

Працэс мае адбыцца восеньню. Ці выстасаваны акт абвінавачаньня процi б. паслоў гэтай партыі—Ваяводзкага і Бальліна—неведама.

Арыштаваньне ў Гарнізоне.

Вайсковыя ўлады ў Хэлме арыштавалі рад падафіцэраў мясцовага гарнізону, якія падазраюцца ў антыдзяржаўнай дзейнасьці. Падробнасьці трымаюцца ў найвялікшай тайне.

Вялікі „камуністычны" працэс.

У Акружным Судзе пачаўся працэс процi 24 абвінавачаных у прыналежнасьці да Камуністычнай Партыі Заходняй Беларусі(?!) у Хэлме.

Канец—добра вядомы кожнаму беларусу.

Суд над украінскімі камуністамі.

„Głos Prawdy" № 108. 18 г. м. Акружны Суд у Любліне абвясьціў прысуд, у справе працэсу сяброў Камуністычнай Партыі Заходняй Украіны

Галоўны абвінавачаны Сурыкаў засуджаны на 6 гадоў цяжкага вастрогу, з пазбаўленьнем правоў; адзін абвінавачаны на — 5 гадоў; 7 — па 4 гады і адзін на два гады цяжкага вастрогу, усе з пазбаўленьнем праў.

Двух абвінавачаных засуджана па паўтары гады папраўчага дому, аднаго на год і 3 месяцы вастрогу, двух па году вастрогу, аднаго на 10 месяцаў, 6 унявіньнена, а двум выключана справа.

Абвінавачаных бараніла 12 адвакатаў.

Працяжная забастоўка ў Пазнані.

Трываючая ўжо тры тыдні забастоўка кравецкіх работнікаў яшчэ не зьліквідавана. Ваяводзкі інспэктарыят працы склікае ў будучым тыдні канфэрэнцыю працадаўцаў і работнікаў. Калі на гэтай канфэрэнцыі ня прыйдзе да паразуменьня, працадаўцы пагражаюць лёкаўтам (свайго роду забастоўкай).

Можа, ім гэтае лякарства і паможа, але... як кашаль хваробе.

З работніцкага руху.

У фабрыцы „Fuchsa" адбылася работніцкая сходка, на якой пастаноўлена зьвярнуцца да Галоўнага Ураду Работніцкага Саюзу Спажывецкага Прамыслу, каб ён пастараўся аб зрэалізаваньні асьвядчэньня фабрычнай дырэкцыі ў справе выраўнаньня варункаў працы і платы і прыстасаваньня іх да варункаў, існуючых у другіх цукерніцых фабрыках і скасаваньня прэміявай працы.

Старшыня „Piasta" ў Сандоміру—ашуканец.

Польская газэта „Głos Warszawski" № 108 падае вельмі цікавую вестку, аб тым, як спрытна паны ўмеюць карыстаць з „зямельнай рэформы", ці наагул з розных установаў.

Справа ў тым, што старшыня „Piasta" ў Сандоміру, Вінцэнты Косола, спаняверыў вялікія сумы грошы на шкоду дзяржаўнага скарбу. Косола быў доўгія гады сэкрэтаром павятовага земскага ўраду ў Сандоміру і прыймаў удзел пры парцэляцыі дзяржаўных грунтаў.

Як сьцьверджана, у працягу некалькіх гадоў (1925—1928) Касола, браныя ад сялян грашавыя раты за закупленыя грунты, заместа ўплачываць у Дзяржаўны Земляробны Банк, — хаваў іх у сваю кішаню (відаць меў яе не малую!), а кантролі павятовага земскага ўраду прадстаўляў фальшывыя квіты.

Але ў пачатку г. году справа вышла наверх. Косола, з'арыентаваўшыся(!) выехаў у Варшаву, а адтуль—у нявядомым кірунку.

Відна, што быў спрытны, калі ўсюды „арыентаваўся"!

Ад'емны білянс ў сакавіку.

Паводле афіцыяльных даных, білянс у сакавіку выказвае перавагу ўвозу над вывазам Польшчы на 170 мільёнаў злотых.

„Strzelec — milicją".

Як падае „Dz. Wileński" № 89, у найбліжэйшым часе маюць выехаць у Італію чатыры дзеячы „Strzelca", з мэтай запазнацца з арганізацыяй фашыстаўскай міліцыі. Гэтыя арганізацыйныя мэтоды маюць стасавацца да „Strzelców", які такім чынам перарабіўся б на польскую фашыстаўскую міліцыю.

Так падае эндэцкая газэта!

Плян польска-літоўскіх перагавораў.

20.IV г. году сабраліся ў Бэрліне польскія і літоўскія старшыні трох камісіяў, устаноўленых на канфэрэнцыі ў Крулеўцу (Кэнігсбэрг).

За згодай з двух старон устаноўлена, што першая камісія бясьпячэнства і адшкадаваньня зьбярэцца ў Коўні 7 траўня, другая гаспадарчая і транзытова-камунікацыйная зьбярэцца ў Варшаве 18 траўня, а трэцяя—праўная і лёкальнага (мясцовага) руху—зьбярэцца ў Бэрліне 21 траўня.

Напад на палац п. Прэзыдэнта.

Як падае „Kurjer Wileński" ў № 91, ноччу 21 гэтага месяца нявядомыя спраўцы прабавалі даканаць нападу на палац прэзыдэнта ў Спале.

Аб нападзе зразу-ж завядомілі каманданта мясцовага пастарунку, які за некалькі мінут прыбыў у палац і распачаў сьледзтва.

У часе сьледзтва за некалькі мэтраў ад палацу знайшлі ляжачага ў крыві паліцыянта, які той ночы меў службу каля палацу.

Гэты паліцыянт паказаў, што, абходзячы будынак паміж 2 і 3 гадзінай ночы, убачыў папацемку на адлегласьці 200 шагоў 2 нявядомыя асобы, якія краліся да палацу.

Незнаёмыя, заўважыўшы паліцыянта, пачалі ў яго страляць, пры чым, адна пуля папала яму ў ногу.

Ранены паліцыянт абсунуўся на зямлю, і прадаўжаў страляць у ўцякаючых напасьнікаў, якія карыстаючы з цемнаты — ўцяклі

Сьледзтва йдзе далей. Да якой сьмеласьці, да якога поступу дайшлі напады ў Польшчы!

Польска-латвійская гандлёвая ўмова.

Як падае „Kurjer Wileński" ў № 91, польскае пасольства ў Рызе даручыла латвійскаму ўраду ноту, заключаючую асьвядчэньне, што з пагляду на тое, што да гэтага часу яшчэ ня выменена ратыфікацыйных (зацьвярджаючых) дакумантаў тымчасовае польска-латвійскае ўмовы, Польшча гатова застасаваць да Латвіі, на падставе ўзаемнасьці, усе прывілеі, прадбачаныя ў гэтай умове.

Латвійскі міністар заграгічных спраў выразіў на гэта згоду.

Чаму-ж не згадзіцца: даюць—бяры!

Заграніцай.

Міністар Залескі ў Рыме.

На ўрачыстым банкеце ў Рыме, наладжаным Мусоліні ў чэсьць мін. Залескага, абодва кіраўніка заграгічнай палітыкі прыязных краёў абмяняліся вельмі сардэчнымі прамовамі, падчырківаючы традыцыйную (старадаўную) сымпатыю Італіі да польскай справы ды асаблівую важнасьць далейшай цясьнейшай прыязьні паміж Польшчай і Італіяй дзеля міру ў Эўропе. Нямецкая прэса асабліва падчырківае тое месца ў прамове Мусоліні, дзе ён кажа, што Італія „першая выступіла з жаданьнем адбудовы Польскай дзяржавы і заўсёды з гарачым запалам падтрымлівала слушныя тэрытарыяльныя жаданьні Польшчы". Нямецкая прэса відзіць у гэтым — абяцаньне Мусоліні і ўдалейшым падтрымліваць польскае становішча—аб нятыкальнасьці польска-нямецкіх граніцаў, — навет процi перагляду так-званага „польскага калідору". Гэтае мейсца, кажа яна, крыху адкрывае зьмест тых перагавораў, якія маюць давясьці да гэтай „цясьнейшай прыязьні", аб якой кажуць прамовы. Французская прэса бачыць у гэтых словах абяцаньне Мусоліні — падтрымаць польскую пазіцыю ў польска-літоўскім споры — у Радзе Лігі Нацыяў...

Газэты пішуць, быццам адным з найважнейшых гаспадарчых пунктаў перагавораў, якія меў вясьці з Мусоліні мін. Залескі, зьяўляецца справа ўвозу польскага вугальля ў Італію. Вестцы гэтай суадказвае распачаўшаяся ў Кракаве канфэрэнцыя дэлегатаў польскага, аўстрыяцкага і чэха-славацкага ўрадаў—у справе транзыту польскага вугальля праз Аўстрыю і Чэха Славакію—у Італію. Як ведама, да вайны Італія, ня маючая ўласнага вугальля, была ў гэтым тавары цалком залежная ад Англіі.

Аб гэтым выразна кажа і чэха-славацкая прэса. „Падарожа мін. Залескага, кажа орган людоўцаў, стаіць у зьвязку з „гаспадарчай вайной", якую вядзе англійскі вугаль з польскім. Дык ідзе Польшчы аб здабыцьцё італьянскага рынку, адабраўшы яго ад англійскага".

Маніфэстацыя англійска-нямецкай прыязьні ў Бэрліне.

У той час, калі Мусоліні вядзе „палітычны флірт" з цэлым шэрагам дыпляматычных кіраўнікоў дзяржаваў паўдзённа-ўсходняй Эўропы, у Бэрліне адбылася афіцыяльная маніфэстацыя англійска-нямецкай прыязьні. Мін. Штрэзэман наладзіў урачысты раўт у чэсьць прыехаўшай у Бэрлін групы англійскіх парлямэнтарыяў, з мініст. Бэркэнхэдам на чале. У сваей вялікай прамове Штрэзэман асабліва падчырківаў тую сталую сымпатыю і ролю абаронца Нямеччыны, — у часе найвастрэйшых атакаў на яе — пасьля вайны. Ківаючы, трэба думаць, у бок Францыі, Штрэзэман сказаў, што — „каб чым хутчэй зацерліся ўсе сьляды вайны, трэба, каб кіраўнікі палітыкі дзяржаваў адносіліся адзін да аднаго з вялікшым паважаньнем. „Ніхто ня можа ведаць сёньня, заявіў Штрэзэман, у якім кірунку пойдзе разьвіцьцё народаў". Дык чым больш цеснае супрацоўніцтва англійцаў з немцамі, добра ўжо выпрабаванае за апошні час, найлепш запэўніць Эўропе найкарысьнейшы поступ у ва ўсіх галінах. Англійскі міністар, падзякаваўшы нямецкаму ўраду і грамадзянству за гасьцінасьць, заявіў, што — ня толькі памысны поступ, але папросту існаваньне эўрапэйскай цывілізацыі будзе залежаць ад таго, ці ўдасца аб'яднаць на супольнай працы ўсе тыя дзяржавы, якія нядаўна бароліся паміж сабой на полі бітвы.

Ажыўленьне дзеяльнасьці македонскіх рэвалюцыянераў на югаслаўскім пагранічча.

Белградзкая прэса даносіць аб узнавіўшайся дзеяльнасьці македонскіх рэвалюцыйных арганізацыяў на пагранічча з Баўгарыяй. У апошнія дні зроблены напад на жандармскі пастарунак на адной з станцыяў. Другі напад зроблены на такі-ж пастарунак на грэцка югаслаўскай граніцы. Югаслаўскія газэты даносяць, быццам на баўгарскай тэрыторыі сьпешна творацца новыя „чэты" (банды) пад павадырствам ведамых македонскіх рэвалюцыянераў—Пустева, Гусева і Цыглінскага.

Ці ня ў сувязі гэта з новай палітыкай Мусоліні?

У Маскве трывога.

„ПАТ" у тэлеграме 21/IV паведамляе: „Радавыя газэты, абгаварваючы польскі ваенны бюджэт, даюць такія загалоўкі тэлеграмам з Варшавы: „Ліхарадачная падрыхтоўка да новых войнаў", „Ваенная падрыхтаванны ў поўным ходзе" і г. д. „ПАТ" дадае, што ваенны бюджэт Радаў складае 869 мільёнаў руб., што на польскую валюту дае 4 мільярды злотых. Новы бюджэт гэты на 17 проц больш леташняга".

Літоўска-нямецкія перагаворы ў Бэрліне.

Адначасна з распачаўшайся ў Бэрліне сэсіяй аднэй з камісіяў польска-літоўскай канфэрэнцыі ў Бэрліне-ж будуць вясьціся і літоўска-нямецкія перагаворы ў справе заключэньня тарговага трактату. Ужо два гады, як ідуць гэтыя перагаворы, а фармальнага гандлёвага трактату яшчэ не надпісана. Галоўным, чыста гаспадарчым дамаганьнем Літвы зьяўляецца—права неабмяжаванага ўвозу ў Нямеччыну літоўскага мяса. Але процi гэтага паўстаюць асабліва ўзмацаваўшыяся за апошні час нямецкія аграрыі (абшарнікі) з усходняй Прусіі, пазываючыся на канкурэнцыю таннага літоўскага мяса, забіваючую краёвае жывёлаводз. Але, як ведама, больш важнымі ўва ўзаемных адносінах Літвы і Нямеччыны зьяўляюцца справы палітычныя, як напрыклад, правы нямецкага насяленьня ў Клайпэдзе, асабліва роля палітычных дарадцаў пры літоўскім урадзе і г. д. Гаспадарча Літва без параўнаня больш заінтэрэсавана ў Нямеччыне: у тарговым балянсе Нямеччыны лічбы яе ўвозу — вывазу да Літвы ня йграюць значнай ролі, але ў балянсе Літвы тарговыя стасункі з Нямеччынай займаюць вельмі выдатнае месца. Нямецкі ўвоз у Літву, напрыклад, складае палову ўсяго літоўскага ўвозу. Але Нямеччына цяпер — у зьвязку з распачацьцем польска-літоўскіх перагавораў — баіцца польскай гандлёвай канкурэнцыі ў Літве, якая можа расхістаць палітычныя ўплывы Нямеччыны ў Літве.

Ці цяпер будзе падпісаны трактат нямецка-літоўскі, сумліўна. Так прынамсь цьвердзяць наглядчыкі ў Бэрліне. Справа ў тым, што новыя выбары ў Нямеччыне праз месяц. На выбарах спадзяюцца значнага разгрому тых нацыяналістаў-аграрыяў, якія цяпер так перашкаджаюць гаспадарчаму паразуменьню з Літвой. Дык трэба думаць, што і падпісаньне трактату будзе адкладзена напасьля, калі новы Сойм створыць і новы Урад.

Як ведама, такі ж лёс спаткаў і польска-нямецкія перагаворы.

Цікаўная інтэрпэляцыя ў англійскім парляманьце.

Англійская работніцкая партыя ўнасіць у парлямант інтэрпэляцыю:

1) Ці англійскі ўрад упаўнамочыў лёрда Бэркэнхэда зрабіць у Бэрліне важныя палітычныя заявы, скіраваныя проці ССРР;

2) Ці запраўды ў англійскай палітыцы наступіла рэзкая зьмена—у кірунку варожай акцыі проці Радаў, прычым гэтая акцыя мае вясьціся разам з Францыяй і Нямеччынай.

Новы вялікі трэст англійскіх і амэрыканскіх фінансістаў і прамыслоўцаў.

З Лёндану ідзе вестка аб стварэньні новага вялізарнага трэсту, да якога належаць найпаважнейшыя англійскія і амэрыканскія прамысловыя і банкавыя фірмы. Заданьнем трэсту мае быць, як заўсёды, — апанаваньне работніцкага руху і — дыктаваньне цэнаў на вырабы аб'ядиаиых у трэсьце галінаў прамысловасьці. Самі-ж павадыры трэсту кажуць, што маюць „рэгуляваць ды ўпарадкаваць адносіны ў міжнародавай прамысловасьці“. Паўстаньне новага вялізарнага трэсту—лішняя адзнака агульнага міжнародавага працэсу аб'яднаньня і ўзмацаваньня капіталізму. Анархія капіталістычнай канкурэнцыі, панаваўшая да вайны, цяпер зьмяняецца ўсё больш згоднай, аб'яднанай акцыяй міжнароднага капіталу, які — у новай форме акцыі—паразуменьня міжнародав. трэстаў навучыўся дасягаць значна лепшых рэзультатаў—свайго панаваньня ў сьвеце.

Сталы канфлікт паміж Эгіптам і Англіяй.

На апошнюю ноту эгіпецкага ўраду, адкінуўшую рашуча англійскі праект англійска-эгіпецкага трактату, які аддае цалком усю фактычную ўладу ў краі англійскаму камісару, зьдзекуючыся над „прызнанай“ самай Англіяй „незалежнасьцяй і суверэннасьцяй“ Эгіпту, англійскі ўрад адказаў таксама рашучай нотай. Зьмест яе такі: Англія настайвае надалей на ўсіх сваіх дамаганьнях: фактычнага кіраваньня ваеннай сілай краю, аховай чужаземцаў і загранічнай палітыкі дзяржавы. Далей Англія пакідае пад сваім беспасярэднім панаваньнем Судан і ўсё ўзьбярэжжа Суэцкага каналу.

Англійская прэса радзіць Эгіпецкаму ўраду падпарадкавацца, пагражаючы тым, што Англія патрапіць змусіць яго да выкананьня сваіх дамаганьняў. Англія—„ня хоча рабіць ніякіх замахаў на незалежнасьць Эгіпту, але ня можа ўступіць там, дзе закрануты яе інтарэсы, як сусьветнай дзяржавы: яе марскія шляхі камунікацыі. Справа ідзе аб марскім і сухапутным шляху да Індыі, — праз Эгіпет, Суэцкі канал і Аравію.

„Міратворчая“ Амэрыка.

Ваенны міністар Амэрыкі ўнёс у парлямант праект закону—аб дзяржаўным падтрыманьні прыватных фабрыкаў ваеннай прамысловасьці. Міністар матывуе гэта тым, што амэрыканскі народ павінен быць заўсёды — „падрыхтаваны да ўсякіх выпадкаў“. Як ведама, другі міністар Амэрыкі — загранічных спраў—усьцяж вядзе перагаворы аб заключэньні „трактату вечнага міру“, прынамсь паміж 6 вялікіх дзяржаваў. Дык—ці не да гэтага „вечнага міру“ так турботліва згары рыхтуецца ваенны міністар?

Характэрны кангрэс хрысьціян усіх краёў і народаў у Ерусаліме.

У Ерусаліме сабраўся міжнародавы кангрэс хрысьціянскіх (каталіцкіх?) арганізацыяў. Зьехаліся дэлегаты амаль-што ня з усіх краёў сьвету. Выступалі з прывітаньнямі і праваслаўныя патрыярхі Ерусалімскі і іншыя галовы паасобных праваслаўных цэркваў, даючы гэтым абраз пэўнага аб'яднаньня хрысьціянаў у месцы, дзе пачалася хрысьціянская вера. Але даклады розных дэлегатаў з месцаў нарысавалі абраз зусім ужо няхрысьціянскіх узаемных адносінаў паміж „хрысьціянамі“ розных імпэрыялістычных краёў і іх калёніяў ды паў-калёніяў. Асабліва забойча скардзіліся прадстаўнікі розных „каляровых“ народаў, горача пратэстуючы проці нацыянальнага, палітычнага ўціску і эканамічнага вызыску з боку пануючых над імі народаў. Павадыр індускіх хрысьціянаў доктар Датта вострa пратэставаў проці палітыкі англійскага „хрысьціянскага“ ўраду ў Індыі. Дэлегат з Філіпінскіх астравоў праф. Бокобо скардзіўся на каляніяльную палітыку амэрыканскай улады. Рэктар нэгрскага ўнівэрсытэту у Злучаных Штатах доктар Хоп пратэставаў з фактамі ў руках проці перасьледаваньня чорнай расы ў Амэрыцы. Дэлегацыя карэйскіх хрысьціянаў востра закідала японскім хрысьціянам, якія асталіся нячулымі дый бязьдзейнымі, калі—пасьля зямлітрасеньня ў Карэі — пачаліся пагром і рэзьня карэйскіх хрысьціян у краі. Нішто сабе!

Справа амэрыканскіх фашыстаў перад судом.

У месьце Пітсбург ідзе працэс амэрыканскіх фашыстаў, так зван. „Ку-Клукс-Клан. Гэтая арганізацыя ўславілася сваім тэрорам, пераважна проці работнікаў, жыдоў і нэграў. Шмат сьведкаў сцьвердзілі цэлы сьцяг выпадкаў гэтага тэрору. Адзін з сьведкаў паказаў пад прысягай, што бачыў на свае вочы 8 чалавек, павешаных на дрэве, падпаленых на кастры. Іншыя сьведкі казалі аб тым, што гэта арганізацыя ладзіла начныя налёты, каб бамбардаваць ды паліць дамы малітвы і іншыя ўстановы сваіх праціўнікаў, якіх пры гэтым забівала.

Наша хроніка.

Вялікі камуністычны працэс у Беластоку. Як падае польская прэса, 17-га красавіка пачаўся вялікі камуністычны працэс у Акружным судзе ў Беластоку. Абвінавачваных 135 чалавек.

Па словах буржуазнай прэсы, абвінавачваныя—сябры Цэнтральнага Камітэту К. П. З. Б., зьліквідавана ў 1925 годзе ў Беластоку, у сувязі з чым былі арышты і ў Вільні. Арыштаваныя ў Вільні 60 камуністых да працэсу сядзелі ў Віленскіх вастрогах, цапер-жа іх перавязьлі ў Беласток, гдзе і судзяць.

Суд пратрывае пэўна некалькі месяцаў і, пэўна... нікаму „спуску ня дасьць“.

Забойства ў Беласточчыне. У Вялікай Праставіцы знайдзены труп вайсковага асадніка Казімера Кляйна, які быў забіты некалькімі ўдарамі ў галаву і ўкінуты ў яму з вадой. Дамысьляная мэта забойства—рабунак, бо Кляйн некалькі дзён перад тым атрымаў 1500 злотых пазычкі.

Забастоўка ў Беласточчыне. Як падае „Rzeczpospolita“ № 116, работнікі тартачнікі ў Ліпоўцы забаставалі з поваду адкіненьня дэрэкцыяй фабрыкі жаданай работнікамі падвышкі 60 працэнтаў платы.

Узрост безрабоцьця ў Беластоку. Скуткам прамысловага крызісу ўнярухомена фабрыка сукна Шляхтэра, дзякуючы чаму некалькі дзесяткаў работнікаў страціла працу. (Rzeczp. № 110).

Арыштаваньне зьбіраючых ахвяры на „Грамадоўцаў. Rzeczp. № 110 падае, што ў раёне Лепля (?) арыштавана некалькі „агітатараў“, зьбіраючых „складкі“ для арыштаваных „Грамадаўцаў“.

Камуністычны працэс у Навагрудку. „K. W.“ № 87 паведамляе, што 17-га г. месяца закончылася разгляданьне „працэсу 18“, абвінавачваных у камуністычнай дзейнасьці на абшарах Навагрудзкага ваяводзтва. Акт абвінавачаньня закідае ім прыналежнасьць да К. П. З. Б., а іменна да Акружнага Камітэту К. П. З. Б. ў Баранавічах, да раённага Саюзу Камуністычнай Моладзі ў Навагрудку і да падраённых камітэтаў К. П. З. Б. ў Дзятлаве і Ганцэвічах.

Акружны Суд у Навагрудку засудзіў: Аляк. Кімкуна і С. Малька на 6 гадоў цяжкага вастрогу; Ляскіна, Бэрэмса і Мінячa на 4 гады цяжкага вастрогу; Сорвіч, Негіявіцкага, Канстаноўскага і Садноўскага на 3 гады цяжкага вастрогу; Юдэлеўску і іншых на 2 гады цяжкага вастрогу. Рэшта ўняўвіньнена. Колькі-ж гэтай рэшты?

Надужыцьці ў „P. K. U.“ ў Слоніме. „K. W.“ № 87. У сувязі з надужыцьцямі ў „P. K. U.“ у Слоніме, арыштаваны капітан Явіцкі. У гэтай „афэры“ падобна, што замешана многа цывільных асобаў, з якіх да гэтага часу арыштавана 7 — галоўных пасярэднікаў у акцыі выдаваньня фальшывых дакумэнтаў, звальняючых з вайсковай службы.

А колькі-ж іх не арыштаваных і не галоўных, калі гэтак многа арыштаваных з галоўных?

Безрабоцьце ў Віленшчыне. „Kur. Wil“. № 86 падае, што па астатніх статыстычных даных агульны прыблізны лік бeзработных на абшары Віленскага ваяводзтва раўняецца 5,055 чалавек. На Вільню прыпадае 4,899 чалавек. У параўнаньні з папярэднім тыднем, безрабоцьце ў Вільні павялічылася на 88 чалавек.

Даражыня... й даражыня. Гэтымі днямі ў старасты на м. Вільню была дэлегацыя саюзу жыдоўскіх гандляроў. Дэлегацыя прасіла перагляду цэнаў на каляніяльныя тавары, тлумачы свае жаданьне значнай падвышкай цэнаў у гуртовым гандаю.

Просьбу гэтую староства прыняло прыхільна.

Набор земляробных работнікаў у Францыю. 11-га г. месяца ў Сьвянцянах, а 12 ў Маладэчне, адбыўся набор земляробных работнікаў у Францыю. У выніку гэтага набору зэркутавана 13 мужчын і 7 жанчых у Сьвянцянах і 16 мужчын і адна жанчына ў Маладэчне.

Мусіць на „Крэсах“ бяззямельле і безрабоцьце, калі беларусы йдуць па кусок хлеба аж да францускіх экоплёататараў. А весь асаднікам—дык ёсьць зямля!

Патаемнае забойства. У лясьніцтве Янішчы, Лідзка павету, у часе вячэры, стрэлам праз акно, забіты лясьнік Здановіч. Куля трапіла якраз у сэрца, пры чым цяжка раніла матку Здановіча. Забойца невядомы.

Прыпушчаюць, што гэта асабістая помста якога нібудзь „kłusownika“, сталым ворагам каторых быў Здановіч.

Як відна, дык на вёсцы жыве беларуская прыказка: „ня служы пану верна“.

Эпідэмія сабачага вар'яцтва. У некатарых воласьцях Вілейскага павету моцна пашыраецца эпідэмія сабачага вар'яцтва. У адной вёсцы ёсьць блізка 20 чалавек пакусаных.

Гэтым даводзіцца да агульнага ведама, што ў м. Горадні адчынена

Беларуская кнігарня,

якая будзе функцыянаваць пад кіраўніцтвам П. Кізевіча і Н. Ламашэвічанкі
Адрас: вул. Мяшчанская № 9.

Карэспандэнцыі.

Змаганьне за каапэратыву „Сноп“ у Глыбокім.

(Дзісеншчына).

Дзякуючы стараньнем б. пасла Мятлы, хоць з вялікімі труднасьцямі, удалося залажыць адзіны каапэратыў у Глыбокім—„Сноп“.

Гэты каапэратыў „Сноп“ быў для нашых працоўных грамадзян вялікай радасьцяй і шчасьцем. Бо ведама, ня йдзе наш селянін да нейкай прыватнай крамкі, гдзе яго за кожным разам ашуківаюць, а ён ішоў да свайго ўласнага каапэратыву — ведаючы, што яго ні на грош не ашукаюць, бо гэта ёсьць яго-ж уласнасьцяй — агульнай, нашай. Але як звычайна тут, калі што небудзь народнае беларускае, дык лічыцца антыпаньствовым.

Урад каапэратыву заарыштаваны. Цяпер застаецца адно: выбраць у урад сваіх людзей — паноў. Гэтак і робіцца.

На 1 красавіка 1928 г. быў скліканы агульны сход пайшчыкаў, але наш загадчык Язэп Пабязінскі разаслаў позна паведамленьні, а навет магчыма што і некаторым нашым сялянам — не паслаў, бо тут і была гэта камбінацыя, каб выбраць у ўрад паноў. На сход прышло толькі трох сьвядомых беларусаў, а рэшта розныя няпрыхільнікі нашы, а паны вакалічныя і вучыцялі на чале з дырэктарам тутэйшай польскай гімназіі. Вось пачаліся выбары: прапануюць на старшыню дырэктара польскай гімназіі; тут пачаліся крыкі і пратэсты, што ня можа быць важны агульны сход, бо няма большасьці сяброў — пайшчыкоў і нейкім цудам удалося адлажыць сход да 22 красавіка 1928 году.

З наступным парадкам дня:

1) Справаздача за прошлы год.
2) Выбары Ураду.
3) Выбары Наглядной Рады.
4) Вольныя прапазіцыі.

Даводзіцца да ведама ўсіх сяброў — пайшчыкаў каапэратывы „Сноп“, што агульны сход адбудзецца **22 красавіка 1928 года.** Прысутнасьць усіх нашых сяброў абавязкавая, бо ад гэтага залежыць далейшае жыцьцё нашага каапэратыву „Сноп“, каб ня даць наш каапэратыў „Сноп“ у рукі чужынцам і розным правакатарамі а выбраць праўдзівых нашых абаронцаў.

Я. Няшчасны.

Мы робім сваю культурную працу.

(З Дзісеншчыны).

Ня ведаем за што наша культурная ўстанова (Акр. Упр. Т. Б. Ш.) спатыкала рэпрэсіі ад улады і розныя арышты нашых больш сьвядомых актыўнейшых культурных працаўнікоў.

Ах, якую боль адчуваюць нашыя сяляне, прыходзячы да Акружной Управы ў бібліятэку, каб пачытаць газэтку ці кніжку. І дзівяцца, за што гэта іх сяброў забралі — ці за тое, што яны—беларусы?! Увесь наш прэзыдыум Акружной Управы адвезены на Лукішкі, як гэта было з 1 на 2 лютага г. г.

А правакатары і „шпіцлі“ цешацца, што наша культурная арганізацыя „сьпіць“, навет думаюць, што яна не прачнецца.

Але ня гледзячы на пастрахі „шпіцляў“, зноў находзяцца маладыя сілы, хоць менш практычныя і прыступаюць да працы: робяць рэпэтыцыі і думаюць на Вялікдзень ставіць спэктакль. Тут таксама спатыкаемся з старастам, які таксама робіць розныя перашкоды, каб ня даць магчымасьці для пастаноўкі спэктакля-вечарыны. Цяпер гатуем наступныя п'есы: „Суд“ і „Нодны Шляхюк“, пасьля будуць дэклямацыя і скокі.

29.III 1928 г. быў вулічны збор на карысьць нашай культурна-асьветнай установы Т-ва Бел. Школы. І тут „шпіцлі“ ня спалі, бо пачалі адбіваць моладзь, каб ня йшла на збор, але, ня гледзячы на ўсе перашкоды, сабралі 107 зл. 70 гр. (сто сем зл. і семдзесят гр.). Шчырая падзяка ўсім актыўным працаўнікам, якія бралі і бяруць удзел у нашай культурнай арганізацыі, а трусам і правакатарам ганьба!

Я. Няшчасны.

Хв. Ільляшэвіч.

Над возерам.

Месяц выплыў з-за сухіх чаротаў над возерам. Серабрыстыя дарожкі пабеглі ўдаль, да небасхілу, дзе над самай вадой расьцьвітае зорка. Успыхвае, сінім колерам, фіялетавым, чырвоным; то замірае, замірае... Вецярок моўчкі, няпрыметна цалуецца з старым возерам. Дарожкі, як палатно, зыбяць пад яго павевамі, як люстра, адбіваюць у сабе адвечную таймнасьць. Дрэвы спусьцілі свае косы—цені.

А здалёк, з вазёрнага вастраўка, льлецца песьня вяковае гармоніі. Быццам вазёрная тонь пяе. Быццам возера пасылае свае маленьні вялікаму вечнаму прастору. Вецярок падхопліваe пераборыстыя выкі і разносіць іх па неабмежаных палёх, зьлівае з шопатам калосьсяў, рассявае чароўныя песьні ночы. Нешта нявымоўна прыгожае ўліваецца ў душу.

Поп шпіёнам?

(Вялейскага павету, Куранецкай воласьці).

Касуцкай парафіі сьвяшчэньнік Аляксандар Лапіцкі займаецца сыскам, як гэта былі нядаўна сцьверджаны факты: — спаўняючы свае духоўныя абавязкі — споведзі, ён, айц. Аляксандар Лапіцкі пытаўся ў сялян з вёскі Малмых, да якой яны партыі належаць, за які нумар галасавалі ў Сойм і т. п.

І сам-жа, ня гледзячы, што стаіць на становішчы духоўным, агітаваў у царкве перад галасаваньнем, каб галасавалі за нумар 20 г. з. расейскіх чорнасоценцаў. І паміж іншым казаў, што гэта ёсьць наш нумар, на якім настаўлены запраўдныя абаронцы—расейцы, якія будуць бараніць нашы інтарэсы.

Але ясна, з сялян ніхто не зьвярнуў увагі на яго агітацыю.

Мы ўжо вас, айцы духоўныя, добра ведаем: ваўка ў лес цягне.

Галубок.

Паштовая скрынка.

А.—ч. За верш дзякуем. На жаль, надрукаваць яго можам, бо ён за сабою можа пацягнуць газэту ў пэўны архіў.—**Явару.** Падаючы вершы, трэба, побач з псэўданімам, падаць і сваё запраўднае прозьвішча. Інакш рэдакцыя не зьмяшчае.—**Я. Дванацатаму.** Вы лепш свае вершы зьмяшчайце ў вучн. часопісях.—**С. Я. з пад Радашковіч.** Ваш верш не надаецца да друку, Вы лепш пішыце карэспандэнцыі з тамашняга жыцьця—аб зьдзеках прадвыбарных і паўвыбарных. — **Агню.** Вашы вершы не падыходзяць да друку, Вы лепш пішыце карэспандэнцыі, памагчымасьці выкарыстаем.—**Якцы Башаркевічу.** Калі Вас скрыўдзіў карэспандэнт, то можаце прыслаць вытлумачэньне. Наша рэдакцыя наагул уцікае ад усякіх асабістых непаразуменьняў. — **Палачанцу.** Мы вельмі рады, што ў Вас такія грамадзяне ёсьць і ім чэсьць і пашана; такім чынам Вы робіце ўплыў на сваіх суседзяў.—**Аршуку.** Калі Вы да гэтага часу не атрымалі каапэр. інструкцыі, то прышліце адрас, да каго Вы выслалі грошы. — **В. Прахожаму.** Вы лепш самі пастарайцеся зрабіць уплыў на сваіх маладых суседзяў, а таго, хто зьбівае з дарогі маладыя сілы — байкатуйце.

Кожная беларуская хата,
Кожная беларуская бібліятэчка,
Кожны Гурток Т-ва Бел. Школы
павінен мець у сябе прыгожы камплект

„МАЛАНКІ“

за мінулы год, у якім зьмяшчаецца каля тысячы розных жартаў, вершаў, фэльетонаў і вялікая колькасьць актуальных карыкатураў з беларускага жыцьця.

Вялікую пацеху зробіце для сябе, знаёмых і суседзяў, чытаючы ім „МАЛАНКУ“.

Цана кампленту з перасылкай ТРЫ зл. (заказн. перас. 3 зл. 50 гр.).
Заграніцу: два кампленты — адзін даляр.

А таксама прыймаецца падпіска на двохтыднёвую беларускую „МАЛАНКА“ гумарыстычную часопісь

ПАДПІСНАЯ ЦАНА: На год—8 зл., на паўгода—4 зл. на тры мес.—два зл.;
ЗАГРАНІЦУ: на год — 1 дал.; на паўгода — 1/2 даляр.

Адрэс рэдакцыі: Вільня, Гэтманская вул. № 2 Рэдакцыя „МАЛАНКА“.

Рэдактар-Выдавец: А. Лагода.

Друкарня Я. Левіна, Вільня, Нямецкая 22.